УДК 39(476)+908(476)

*І.А. МАРЗАЛЮК*

# МІСІЯНЕРСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ НА ЗЕМЛЯХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ І ЯЕ НАСТУПСТВЫ

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

Надзвычай важным момантам беларускай этнакультурнай гісторыі сярэднявечча з'яўляецца місіянерская дзейнасць праваслаўнай царквы ў балцкім асяроддзі. Дазволім сцвярджаць, што менавіта місіянерская дзейнасць праваслаўнай царквы на ўласна балцкіх землях ВКЛ, якая разгортвалася поруч са славянскай каланізацыяй, у рэшце рэшт прывяла да акрэслення этнаграфічных межаў Беларусі з Літвой, адлюстраваных на знакамітай карце Яўхіма Карскага.

Як вядома, працэс гэты распачаўся яшчэ ў эпоху Кіеўскай Русі. Знакамітыя даследчыкі археалагічных помнікаў Віленшчыны археолагі У. і А. Галубовічы даказалі, што асваенне ўсходнімі славянамі Завілейскай зямлі пачалося ўжо ў X – XIII стст. На ўсходняй частцы гэтай тэрыторыі, паміж рэкамі Вілія і Дзісна, яны вылучылі магутны клінападобны масіў славянскіх могільнікаў і паселішчаў. Наяўнасць у пахаваннях характэрных для крывічоў упрыгожванняў дазваляе гаварыць аб асваенні гэтых земляў палачанамі [1, с. 126-127]. Археалагічныя даследаванні Галубовічаў на тэрыторыі Вільні прывялі іх да адкрыцця тут вялікага славянскага паселішча. Усходнеславянскія культурныя напластаванні яны датавалі XI – XIII стст. [2, с. 114-125]. Беларускі археолаг Ю. Заяц скарэктаваў датаванне і паказаў, што матэрыялы XI ст. у Вільні адсутнічаюць, а ўсходнеславянскі рэчавы комплекс дазваляе датаваць культурны слой Вільні XII – XIII стст. Усходнеславянскі культурны слой быў зафіксаваны не толькі на тэрыторыі Крывога горада, але і на Верхнім замку (гара Гедыміна) [3, с. 88].

Да часоў Крэўскай уніі вялікія князі літоўскія не чынілі ніякіх перашкодаў місіянерскай дзейнасці праваслаўнай царквы на ўласна балцкіх этнічных тэрыторыях. Менавіта надзея на поўную хрысціянізацыю Літвы штурхала Канстанцінопаль да ўступак у пытаннях стварэння асобнай праваслаўнай мітраполіі для ВКЛ [4]. Аб поспехах хрысціянізацыі (resp. рутэнізацыі) ва ўласна літоўскіх землях ды ўзнікненні на тэрыторыі Віленшчыны і Ковеншчыны праваслаўных прыходаў вельмі красамоўна сведчаць створаныя ў XIV – XV стст. крыніцы. У 50-х гадах XIV ст. візантыйскі гісторык Нікіфар Грыгора склаў вучоны экскурс, у якім ён сцвярджаў, што народ Рос падзяляецца на тры альбо чатыры Русі: тры хрысціянскія і адну паганскую, якая, як ён з гонарам дадаў, амаль непераможная, супрацьстаіць татарам і не плаціць ім даніну, як гэта робяць іншыя Русі. Гэтая чацвертая Русь – Альгердава Літва [5, с. 134]. *Notitiae episcopatuum*, у якіх згадваецца аб стварэнні каля 1300 г. літоўскай мітраполіі таксама, уключаюць Літву ў агульнасць Русі [Тамсама].

Але найкаштоўнейшай і найважнейшай крыніцай па гэтым пытанні для нас з'яўляецца інфармацыя, змешчаная ў "*Списке русских городов дальних и ближних*". На сённяшні дзень гэтая крыніца надзвычай добра вывучаная. Даказана, што дакумент паўстаў у канцылярыі кіеўскага мітрапаліта Кіпрыяна, а пералічаныя ў "Спісе" "*гроды*" з'яўляліся цэнтрамі царкоўных прыходаў, якія плацілі даніну мітрапаліту. З гэтымі тэзамі салідарызуюцца ўсе даследчыкі "Спіса" [6, с. 142;

7, с. 150-164; 8, с. 164; 9, с. 31]. Да "рускіх" (г. зн. маючых праваслаўныя прыходы і праваслаўных вернікаў з "рускай" этнаканфесійнай самаідэнтыфікацыяй) у "Спісе" аднесены таксама такія гарады, як Кернаў, Коўна, Вількамір'е, Майшагола, Вільня, Старыя Трокі, Новыя Трокі, Пуня і Пералай [10, с. 95]. Расійскім акадэмікам В. Яніным зусім нядаўна было прапанавана вельмі аргументаванае ўдакладняючае датаванне часу стварэння "*Списка русских городов дальних и ближних*". Вучоны лічыць, што "Спіс" узнік не раней 1375 г. і не пазней 1381 г. [11, с. 67].

Такім чынам, у гэты час у згаданых тут гарадах Літвы ўжо фіксуецца "руская" прысутнасць. Паказальным з'яўляецца і прывілей 1387 г. вялікага князя Ягайлы князю Скіргайлу. У ім таксама знаходзім сведчанні аб русінах на поўдні і паўднёвым усходзе ў ваколіцах Вільні і ў Троцкім княстве[12, с. 4; 13, с. 96]. Частка з пералічаных у дакуменце назваў вёсак і імёны баяр маюць выразны ўсходнеславянскі характар: "*село Лебедево ...и што Лебедевьская волостка люди вси и села. Тая околица також Дмитриево село, Груздовица, Анципорово село и Сколувино и Туркгенево село ...села што у Солчницехъ. И в тои волости тое село Иваново, што Андрей держал Борисовичь ...на Ваце село што Борисъ держалъ*" [14, с. 51].

Вельмі красамоўна сведчаць аб русінскай этнаканфесійнай прысутнасці ў Кернаве матэрыялы археалагічных раскопак гарадскога грунтовага хрысціянскага могільніка, які функцыянаваў з канца XIII ст. і да 1390 г. У жаночых пахаваннях знойдзены характэрныя якраз для старажытнарускай гарадской культуры вянкі, прамыя аналагі якім маюцца на тэрыторыі Верхняга Панямоння. Спробы інтэрпрэтаваць гэты могільнік, як і жаночыя ўпрыгожванні, у якасці балцкага выглядаюць несур'ёзна. Нябожчыкі пахаваны на грунтовым могільніку ў поўнай адпаведнасці не з паганскай, а з праваслаўнай абраднасцю [15, с. 383-398]. Пахаванне жанчын з упрыгожваннямі пры безінвентарных мужчынскіх інгумацыях не з'яўляецца адзнакай балцкай спецыфікі, а характэрна якраз для гарадскіх грунтовых усходнеславянскіх хрысціянскіх могільнікаў на тэрыторыі Беларусі XI – XIII стст[16, с. 91-92; 17, с. 124-133].

У крыжацкіх хроніках XIV ст. згадваюцца "*русіны*", якіх храністы адмяжоўваюць ад "*літоўцаў*" (у раёнах Вільні, Трокаў ды Коўны, а таксама ўздоўж ракі Нявяжы) [18, с. 167; 19, с. 92-95; 20, с. 100-104; 21, с. 41-45]. Апісваючы паход Конрада Валенрода ў 1390 годзе ў раён Трок, крыжацкі храніст увогуле ўспрымае гэту тэрыторыю як састаўную частку Русі. Ён піша, што магістар здейсніў паход "*in Russen vor Traken*" ("*на Русь перад Трокамі*") [22, с. 645].

Поспехам місіянерскай дзейнасці праваслаўнай царквы ў "дакрэўскі" перыяд на этнічна балцкіх тэрыторыях спрыяла прысутнасць тут русінскага баярства, аб чым надзвычай яскрава сведчыць інфармацыя, змешчаная ў крыжацкіх хроніках. Першым з даследчыкаў, хто акцэнтаваў увагу на русінскай прысутнасці на этнаграфічна літоўскіх землях у XIV ст., быў слынны польскі медыявіст Генрык Пашкевіч. Яшчэ ў 1938 г. ён пісаў літаральна наступнае: "*На падставе матэрыялаў крыжацкіх крыніц складваецца ўражанне, што этнаграфічная Літва ў той час поўная была русінамі. Не сцвярджаю, што гэта былі заўсёды насельнікі тых земляў, як баярын Іван, жывучы над Нявяжай, але нават і хвілінныя прыбышы, рускія гуфцы, раскіданыя па цэлым краі галоўным чынам як залогі па гарадах, якія маюць таксама каштоўнасць для закранутай тут праблемы. Пустошачы землі паміж Дубісай і Нявяжай і далей да Віллі, бяруць крыжакі да няволі русінаў.*

*Факт гэты пацвярджаецца крыніцамі шматразова. Маем доказы, што Коўна баранілі русіны, што таксама баранілі і Трокі, што на тэрыторыі паміж*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

*Коўна, Трокамі і Вільняй рыцары закону часта выводзілі паланяннікаў рускіх"* [18, с. 167]. На русінскую прысутнасць у гэтым рэгіёне, абапіраючыся на дадзеныя крыжацкіх хронік, звяртаў увагу таксама беларускі эміграцыйны гісторык П. Урбан [19, с. 92-95]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэзы Г. Пашкевіча былі актуалізаваныя ў працах Г. Сагановіча[20; 21].

Характэрная для праваслаўнай усходнеславянскай традыцыі антрапаніміка фіксуецца і ў "Попісе 1528" пры пераліку шляхты з Ашмяншчыны, Ковеншчыны, Трокаў. Рэч ясная, што гэтыя імёны і прозвішчы тут складаюць безумоўную меншасць у параўнанні з літоўскімі, рыма-каталіцкімі. Сярод ашмянскай шляхты сустракаем наступныя прозвішчы: *"Ян Ивашкович, <...> Павел Миколаевич, <...> Дмитр Федорович, <...> Миколаи Ивашкович, <...>Семенъ Володкевич, <...>Иван Глебович, <...>Василеи Ивашъкович, <...>Степан Глебович, <...>Федор Ивашъкович, <...>Остафеи Хмарыч, <...> Ивашковая Омеляновича, <...>Юреи Громыка, <...>Миколаи Федкович"* [23, с. 18]. *"Реестр попису бояр рудоминских"* таксама змяшчае пералік русінскай шляхты: *"Федко Головачевич <...> Митя Иванович <...> Богушъ Федкович <...> Сенковая <...> Миколаи Федкович <...> Федко Олешъкович <...> Миколаи Олешкович <...> Иван Аврамович <...> Грышко Бранца <...> Федько Илкович <...> Гришко Степанович <...> Васко Нацкович <...> Васко Сенковичъ сам. <...>А т о б о я р е р у д о м и н с к и и К у д е л к о в ц ы ...Иванъ Хват з Кгедетоин"* [Тамсама, 44, 46 адв, 49]. Сярод "бояр мемижских" частка належыла да русінаў: *"Ждан Богданович <...> Федор Мамчичъ <...> Андреи Мацкевичъ <...> Сенько Иванович"* [Тамсама, 56]. Кернаўскае баярства таксама было поліэтнічным. У попісе згадваюцца: *"Семенъ Колычов <...> Станко Ивашъковичъ <...> Янушко Ивашкович <...> Сенько Михаилович"*- [Тамсама, 56-57 адв.]. У вількамірскім павеце ў той час жыла невялікая колькасць баяраў-русінаў: *"Добко Ивашкович <...> Андреи Качанович <...> Миколаи Ивашкович <...> Олехно Борисовичъ Бокеи"* [Тамсама, 60, 64]. *"Реистр бояр ковенского повету Троцкого"* ўтрымлівае красамоўныя сведчанні аб прысутнасці тут русінскага баярства: *"Богданъ Васкович <...> Якубъ Жук <...> Ивашъко Кунцевич <...> Игнатъ Андреевич <...> Юри Ивашъкович"* [Тамсама, 76 адв.]. У *"Реистре бояръ жижморских иншыи шляхту"* згадваюцца *"Ивашъко Дуброва з братом <...> Богушъ Ивашъкович <...> Юрыи Ивашъкович <...> Сташ Ивашкович <...> Андреи Ивашкович <...> Васко Петкович"*[Тамсама]. Склад баяр самілішскіх таксама не вызначаўся этнічнай аднароднасцю: *"Хоружыи сомилишъскии Миколаи Ивашъкович <...> Янъ Ивашкович <...> Богушъ Ивашкович <...> Анъдреи Ивашъкович <...> Иванъ Левонович <...> Васко Лазаревич <...> Еско Иванович <...> Федор Сопега"* [Тамсама, 82].

Аб існаванні русінскай праваслаўнай шляхты, якая мела ўладанні ў раёне Вільні, Трокаў і Коўна, сведчаць і іншыя актавыя дакументы XV – XVI стст. [24, с. 3-4; 25, с. 503; 26, с. 256-257; 27, с. 71, 79-80; 28, с. 86-87; 29, с. 196, 197, 225, 292, 328, 372; 30, с. 98-99; 31, с. 42, 188, 206-207; 32, с. 123; 33, с. 36-37, 82-83, 88, 218-219, 222-223]. Апекуном праваслаўных троцкіх цэркваў у канцы XVI – пачатку XVII ст. быў памерлы ў 1612 г. зямянін Троцкага павета – дваранін гаспадарскі Іван Бака. У спадчыну свайму сыну Васілю Іван Бака перадаў 2 маёнткі і дзве вёскі ў Троцкім павеце. Да сына перайшло і права на ўладанне *"озером моим Швентем"*. На той момант яго родны брат Астафей Іванавіч Бака быў суддзёй гродскім троцкім [34, с. 541]. Старастамі праваслаўнага віленскага брацтва ў пачатку XVII ст. былі *"Миколай Быховец и Иван Кроха, земяне повету Троцкого и Ковенского"*, менавіта яны падавалі пратэст ад імя віленскага брацтва *"за отобрание книги Фринос"* [35, Приложение. 183].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Пасля Крэўскай уніі "русіны" і "рускія" цэрквы працягваюць існаваць як этнаканфесійная рэальнасць не толькі ў Вільні, што агульнавядома, але і ў Троках, Коўне і Пуне. Наконт Вільні скажам толькі тое, што напачатку XVI ст. у ёй, безумоўна, дамінавала праваслаўнае русінскае насельніцтва. У гэты час (1506 – 1511 гг.) у сталіцы ВКЛ было 14 праваслаўных храмаў і 8 каталіцкіх касцёлаў. Колькасць цэркваў і касцёлаў паказвае і на склад жыхароў хрысціянскай веры таго часу: прыблізна 2/3 гэта праваслаўныя, рэшта ж католікі. Чацвёртую частку католікаў складалі рамеснікі і купцы нямецкай калоніі ў Вільні [36, с. 68].

Як вынікае з граматы, дадзенай троцкім караімам у 1507 г. Жыгімонтам Старым, Трокі дзяліліся Лебядзіным мастом на дзве часткі: "Рускі канец" – па адзін і "Жыдоўскі" – па другі бок [37, с. 117]. У дадзеным выпадку звернем увагу толькі на факты існавання праваслаўных, "рускіх", цэркваў у Троках. Аб троцкім праваслаўным манастыры Раства Святой Багародзіцы даведваемся з крыніцы (датаваная 1384 г.), якая паведамляе аб наданні яму земляў вялікім князем Вітаўтам: "*Мы велики князь Витовт нареченный во святом крещении Александер, дали мы на просьбу и на жоданье княгини нашое великое Ульяны, к монастыру нашому трцкому рожеству светое пречистое, озера троцкого луку аж до великое дороги*" [38, с. 118]. У гэты час у Троках было дзве праваслаўныя царквы: Раства Хрыстова і Раства Прачыстае Багародзіцы з манастыром. Абедзве гэтыя царквы з манастыром і складалі першапачатковую Трокскую Архімандрыю. Да яе таксама стала належыць і царква Святога Георгія, заснаваная Сапегамі на востраве [39, III]. Аб Троцкім праваслаўным манастыры і Троцкай архімандрыі неаднаразова згадваюць крыніцы XVI ст. [Тамсама, 150-161]. Вельмі каштоўным з'яўляецца рэестр 1594 г. агародаў і земляў, якія належылі Троцкай Прачысценскай царкве. З тэкста дакумента вынікае, што ўсе гэтыя агароды і царкоўны дом былі "*...наданы от нас шляхты, обывателей повету Троцкого*" [Тамсама, 161]. Як бачым, русінская праваслаўная шляхта існавала тут і ў той час. Яшчэ ў 1630 г. Сапегі "трымалі" ў Троках мураваную царкву "*з даўніх вякоў Сапегаўскую, на зямлі і выспе шляхецкай паміж возерам вялікім Троцкім, пры замках у месце Троках <...> у імя Святога Георгія*". Фрыдрых Сапега, перадаючы ў 1630 г. гэтую царкву Льву Сапегу, між іншым патрабаваў, каб "*у той царкве не іншае, а толькі Рускае набажэнства на ўсі прышлыя часы адпраўлялася*" [Тамсама, 163-164]. Каштоўную інфармацыю па гэтым пытанні таксама ўтрымоўвае інвентар 1702 г. (на той час ужо уніяцкай архімандрыі Троцкай). Царква Святога Георгія была мураванай, знаходзілася "*паміж замкамі*" на "*меншым востраве*". Яна скарыстоўвалася ў якасці фамільнага склепа праваслаўных Сапегаў, "*дзе і целы тых жа іх міласцяў паноў Сапегаў ляжаць*" [ Тамсама, 170]. З інвентара вынікае, што акрамя згаданых ужо храмаў у Троках у пачатку XVIII ст. была яшчэ Святатраецкая старадаўняя царква; дакумент таксама засведчыў, што "*касцёл дамініканаў стаіць на старадаўнім царкавіску Раства Хрыстовага, пры касцёле стаіць кляштар тых жа айцоў дамініканаў на цвінтары і пляцах юрыдыкі той жа царквы*"[ Тамсама, 168-169]. Акрамя гэтага, пры пераліку "*дзесяцін, да той архімандрыі належачых*" згадваецца і дзесяціна, якая была ва ўласнасці "*цэркві С. Мікалая ў Троках, ад князя яго міласці Фёдара Іванавіча Яраславіча і праз яго пацверджаная*" ў 1513 г. у Клецку [Тамсама, 173]. У пачатку XVIII ст. царкву тую "трымалі" ўжо бернардыны.

Пуня, ці Пуна, – невялікі гарадок на мяжы Ковенскага і Троцкага ваяводстваў, на паўшляху паміж Меркісам і Коўнам. Менавіта ў гэтым горадзе ў XV ст. быў ізаляваны нешчаслівы прэтэндэнт на Кіеўскую мітраполію Спірыдон Сава. Падчас знаходжання ў гэтым горадзе ён стварыў і прамаўляў перад вернікамі сваё знакамітае павучанне "*В неделю 50-ную на сшествие Святого Духа*". Адбылося гэта,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

паводле аўтарытэтнага меркавання А. Турылава, ў 1476 г., альбо ў адзін з наступных гадоў [40, с. 122-123]. Відавочна, што ў гэты час у Пуне мелася вялікая праваслаўная абшчына, бо ў павучанні мітрапаліт ужывае зварот да "*Пунского града жителем*" і "*пастырем*", г.зн. да праваслаўных святароў [Тамсама, 122]. Падобна выглядала сітуацыя і ў Коўне. З рэскрыпта 1553 г. Жыгімонта-Аўгуста ковенскаму дзяржаўцу Пятру Хвальчэўскаму даведваемся аб існаванні ў гэтым горадзе праваслаўнай царквы Усіх Святых. Гаспадар загадаў дзяржаўцу, каб ён на "*церковь закону греческого в месте Ковенском волоку земли, од платов и подачок и всяких повинностей на поживенне попу*" [41, с. 13] аддаў. У падаўчым лісце 1554 г. ковенскага дзяржаўцы Пятра Хвальчэўскага праваслаўнаму святару Аляксею на адну валоку зямлі для царквы Усіх Святых згадваецца сяло "*Козминское*" [Тамсама, 17]. Назва сяла наводзіць на думку аб яго праваслаўным, "рускім", этнаканфесійным характары. Царква Усіх Святых вядома і па дакументах XVIII ст. У гэты час яна ўжо была уніяцкай. У крыніцы 1757 г. яна фігуруе як "*ritus graeco-uniti*" [Тамсама, 12].

Насельніцтва Кейданаў у пачатку XVI ст. таксама было поліэтнічным. У горадзе ў 1517 г. існавала праваслаўная царква Святога Юрыя. Аб гэтым мы даведваемся з акта продажы зямлі праваслаўнымі зямянамі Ковенскага павета Паўла Станковіча і яго брата Юрыя "*<…>Петру Татарину мещанину кейданскому*". У выпадку парушэння пагаднення Павел Станковіч "*<…> на святого Юрия церковь мает дати 12 коп грошей*" [42, с. 124]. Павелічэнню русінскай прысутнасці ў Кейданах у XVII ст. садзейнічала мэтанакіраваная дзейнасць Януша Радзівіла, які пабудаваў у горадзе (дзеля патраніраваных ім перасяленцаў русінаў з Полацка і Вільні), у "Рускай слабадзе", праваслаўную царкву і надаў ім цэлы шэраг прывілеяў[Тамсама, 362-370]. У 1659 г. тут ужо быў праваслаўны манастыр, на які жонка Януша Радзівіла, малдаўская гаспадарычня Марыя, ахвяравала "*злотых пяцьсот*" [34, с. 588]. У Упіцкім павеце ў XVI ст. таксама сустракаем прадстаўнікоў праваслаўнай русінскай шляхты. У 1585 г. пісарам у Упіцкім гродскім судзе быў Іван Мацковіч. У актавых дакументах гэтага ж павета ў тым жа годзе сустракаем паведамленне пра зямяніна Фёдара Міхайлавіча Каробчыча-Чарняўскага [43, с. 19]. У Упіцкім павеце, як сведчаць пісьмовыя крыніцы, ў 1614 г. быў "*свещеник, поп руский сурдецкий*" [44, с. 144].

Узнікнуць большасць з гэтых праваслаўных прыходаў пасля Крэўскай уніі, калі дзейнічала забарона на будаўніцтва праваслаўных храмаў на тэрыторыі Віленскага і Троцкага ваяводстваў [45, с. 77-81], проста не маглі. Дадзеная акалічнасць дазваляе скарыстоўваць інфармацыю крыніц пазнейшага перыяду ў якасці рэтраспекцыі пра "дакаталіцкі" перыяд канфесійнай гісторыі ВКЛ. Гэта тэза "працуе" найперш у дачыненні да тых этнічна літоўскіх тэрыторый, русінская прысутнасць якіх на гэтых прасторах зафіксавана ў матэрыялах археалагічных і пісьмовых крыніц XIII – XIV стст. Прыток "рускага" насельніцтва на ўласна балцкія землі княства фіксуецца і ў пачатку XVI ст., калі яно ратавалася ўцёкамі з занятых маскоўскімі войскамі ўсходніх тэрыторый [46, с. 22].

Такім чынам, пісьмовыя і археалагічныя крыніцы сведчаць, што і пасля ўтварэння ВКЛ у XIII – XIV стст. працягваўся працэс усходнеславянскай каланізацыі і місіянерскай дзейнасці праваслаўнай царквы на ўласна літоўскіх землях княства. Змена этнаканфесійнай самаідэнтыфікацыі, хрышчэнне балтаў у "рускую" веру ў рэшце рэшт прыводзіла да іх ментальнай і моўнай рутэнізацыі (resp. беларусізацыі) і да выразнага супрацьпастаўлення сябе хрышчаным пасля Крэўскай уніі ў каталіцызм літоўцам. Менавіта гэтая акалічнасць паспрыяла ўзнікненню беларускамоўных паселішчаў у колішнім сэрцы этнічнай літоўскай тэрыторыі, у раёнах Вільні і Трокаў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Голубович Е., Голубович В.*** Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР // КСИМК. – Москва, 1945. – Вып.11. – С.126-127.
2. ***Голубович Е., Голубович В.*** Кривой город – Вильно // КСИМК. – Москва, 1945. – Вып.11. – С.114-125.
3. ***Заяц Ю.*** История Белорусских земель X – первой половины XIII в. в отображении летописей и хроник Великого княжества Литовского // ГАЗ. – Мн., 1997. – № 12. – С.88.
4. ***Trajdos. T.*** Metropolici Kijowscy Cyprian i Grzegorz Camblak (Bulgarscy duchowni prawoslawni) a problemy cerkwi prawoslawnej w państwie Polsko-Litewskim u schulku XIV i w pierwszej ćwierci XV w. Poznań, 1985.
5. ***Шевченко И.И.*** Некоторые замечания о политике Константинопольского патриархата по отношению к Восточной Европе в XIV в. // Славяне и их соседи. Греческий и славянский мир в средние века и раннее новое время. – Москва, 1996. – Вып. 6.
6. ***Насонов А.Н.*** "Русская земля" и образование территории Древнерусского государства. – Москва, 1951.
7. ***Наумов Е.П.*** К истории летописного "Списка" русских городов дальних и ближних // Летописи и хроники. – Москва, 1973. – С.150-164;
8. ***Рыбаков Б.А.*** Русские карты Московии. – Москва, 1979.
9. ***Куза А.В.*** Малые города Древней Руси. – Москва, 1989.
10. ***Тихомиров М.Н.*** Русское летописание. – Москва, 1979.
11. ***Янин В.*** Новгород и Литва. Пограничные ситуации XIII – XV веков. Москва, 1998.
12. ***Jakubowski J.*** Studya nad stosunkami narodowościowemi na Litwie przed Unią Lubelską. – Warszawa, 1912.
13. ***Краўцэвіч А.К.*** Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. – Rzeszow, 2000.
14. Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы. – Мн., 1961. – Ч.І. – С.51.
15. ***Velius G.*** XIII – XIVA. Kernaves kapinyno apgalviai // Lietuvos Archeologija. – Vilnius, 2001. – T. 21. – S.383-398.
16. ***Штыхаў Г.В.*** Крывічы. – Мн., 1992.
17. ***Семянчук Г.М.*** Новая катэгорыя археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (грунтовыя могільнікі XI – XIII стст.) // ГАЗ. – Мн., 1993.
18. ***Paszkiewicz.H.*** O Genezie i wartości Krewa. – Warszawa, 1938.
19. ***Урбан П.*** Да пытання этнічнай прыналежнасці старажытных ліцьвіноў. – Мн., 1994. – С.92-95;
20. ***Саганович Г.Н.*** Русь в прусских хрониках XIV – XV веков // Славяне и их соседи. Славяне и немцы: 1000-летнее соседство: мирные связи и конфликты. – Москва, 1999. – Вып.9. – С.100-104;
21. ***Сагановіч Г.*** Сярэдневяковая Беларусь вачыма нямецкіх храністаў (XIV – пачатак XVст.) // Беларусіка Albaruthenica. – Мн., 2001. – Кн. 21. – С.41-45.
22. SRP. Leipzig, 1863. B. II.
23. НГАБ КМФ 18. Воп. 1, спр.523
24. АСД. Вильна. 1871. T.V.
25. АВАК. Вильна, 1904. T.XXX.
26. Lietuvos Metrika (1387 – 1546) Kn №25. Užrašumų knyga 25. Vilnius, 1998. Литовская метрика (1387 –1546). Кн. Зап. №25. – Вильнюс, 1998. – С.256 – 257;
27. Lietuvos Metrika (1440 – 1498) Kn № 3. Uzrasumų knyga 2. Vilnius, 1998. Литовская метрика (1440 – 1498). Кн. Зап. № 3. – Вильнюс, 1998. – С.71, 79 – 80;
28. Lietuvos Metrika (1440 – 1523) Kn № 10. Užrašumų knyga 10. Vilnius, 1997. Литовская метрика (1427-150?). Кн. Зап. № 10. – Вильнюс, 1997 – С.86 – 87;
29. Lietuvos Metrika (1499 – 1514) Kn № 8. Užrašumų knyga 8. Vilnius, 1995. Литовская метрика (1427 – 1506). Кн. Зап. № 8. – Вильнюс, 1995. – С.196 – 197, 225, 292, 328, 372;
30. Lietuvos Metrika (1522 – 1530) 4-oji Teismu bylu knyga. Vilnius, 1997. Литовская метрика (1522 – 1530). 4-я кн. Судн. Дел. Вильнюс, 1997. С. 98 – 99;
31. Lietuvos Metrika (1528 – 1547) 6-oji Teismu bylu knyga. Vilnius, 1995. Литовская метрика (528 – 1547). 6-я кн. Судн. Дел. – Вильнюс, 1995. – С.42, 188, 206 – 207;
32. Lietuvos Metrika(1533 – 1535) 8-oji Teismu bylu knyga. Vilnius, 1999. Литовская метрика (1533 – 1535). 8-я кн. Судн. Дел. – Вильнюс, 1999. – С.123;


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

33. Lietuvos Metrika (1566 – 1574) Kn № 51. Užrašumų knyga 51. Vilnius, 2000. Литовская метрика (1566 – 1574). Кн. Зап. № 51. – Вильнюс, 2000. – С.36 – 37, 82 – 83, 88, 218 – 219, 222 – 223.
34. АВАК. Т.XII.
35. ***Голубев С.*** Киевский митрополит Петр Могила и его время. – Киев, 1898. – Т.II.
36. Р. М. Хрысьціянскія сьвятыні ў Вільні ў XV – XVI ст. // Запісы. БІНІМ. – New York, 1974. – № 12. – С.68.
37. ***Бершадский С.А.*** Литовские евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии. – Санкт-Петербург, 1883.
38. ***Ластоўскі В.*** Гісторыя Беларускай (Крыўскай) кнігі. – Коўна, 1926.
39. АСД. Вильна, 1867. – Т.II.
40. ***Турилов А.А.*** Забытое сочинение митрополита Саввы – Спиридона литовского периода его творчества // Славяне и их соседи. Межконфессиональные связи в странах Центральной, Восточной и Юго-Восточной Европы в XIV – XV веках. Москва, 1999. Вып. 7. – С.122 – 123.
41. АВАК. – Вильна, 1880. – Т.XI.
42. АСД. Вильна, 1870. Т.VIII.
43. АВАК. Т.XXVI.
44. Raganu teismai Lietuvoje. Parenge K.Jablonscis ir R. Jasas. – Vilnius, 1987.
45. ***Chodynicki K.,*** Kosciol prawoslawny a Rzeczpospolita Polska. – Warszawa, 1934.
46. Новости литовской метрики. – Вильнюс, 1998. – № 2.

## SUMMARY

*The author proves scientifically in the article that after the foundation of the Great Lithuanian. Principality in the XIII – XIV century's process of West-Slavonic colonization and of missionary as trivities of the Orthodox Church on the very Lithuanian lands of the Principality continued. Change of ethnocontessional self-identification and baptism of the Balts in the " russian" faith, ultimately, led to their mentality and language rutenization (resp. belorusization) and to opposition to the Lithuania's who had embraced Catholicism after the Krevskaya Union.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова